да и в марте 1918 г. А. М. Сиверс продолжает критиковать уже новую Советскую власть за развал старой армии, возмущается подписанием Брестского мира, следит за дискуссией вокруг планов создания новой армии, оставаясь при этом пессимистом. Но… Убит главковерх Духонин… Начинаются аресты и убийства высших офицеров старой армии. Возникает институт заложничества. Появляются концлагеря. Арестован зять Сиверса, М. И. Дунин-Борковский, осужден и посажен в концлагерь до «конца гражданской войны». На наше счастье, в подобной ситуации А. М. Сиверс не уничтожил свои дневники, но он изъял из приложения к дневнику многие «исторические документы», как он их называл: вырезки статей из газет, телеграммы, приказы, а сам дневник до предела «засушил». Так, исчезли газетные статьи о семье последнего русского царя, приказы А. Е. Эверта и Л. Г. Корнилова. Исчезло все, что могло спровоцировать лишние вопросы к автору дневника, если бы автор был вдруг арестован. А сам автор натянул на лицо маску «незаинтересованного обывателя».

Тем не менее, дневники генерал-лейтенанта А. М. Сиверса являются важным источником по истории Первой Мировой войны и революции. Благодаря публикации издательства «Кучково поле» они стали доступны широкому кругу исследователей.


1. Волков, С. В. Офицеры российской гвардии / С. В. Волков. – М., 2002. – 571 с.
2. Высочайшие приказы по военному ведомству // Разведчик. – 10.03.1915. – № 1270.
3. Залесский, К. А. Кто был кто в Первой мировой войне / К. А. Залесский. - М., 2003. – 894 с.
4. Сайт «Русская армия в Великой войне» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.grwar.ru/persons/person/984.
5. Сиверс, А. М. Дневник. 1916–1919 / А. М. Сиверс / сост. А. Б. Гуларян. – М. : Кучково поле, 2019. – 800 с.


**Бароўка В. Ю.**

## АКСІЯСФЕРА САЛДАТА ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРАХ "НА ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЕ" М. ГАРЭЦКАГА І "НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ БЕЗ ЗМЕН" Э. М. РЭМАРКА

Мастацкія творы – адмысловая гістарыяграфічная крыніца. У знакамітай працы "Аб мастацтве паэзіі" Арыстоцель зазначаў адрозненні паміж літаратурай і гісторыяй, падкрэсліваў, што "задача паэта гаварыць не пра тое, што сапраўды адбылося, а пра тое, што магло адбыцца, значыць, пра магчымае па верагоднасці ці па неабходнасці. Менавіта гісторык і паэт адрозніваюцца [адзін ад аднаго] не тым, што адзін карыстаецца памерамі, а другі не: можна было б перакласці вершам працы Герадота, і тым не менш яны былі б гісторыяй, як з метрам, так і без метра; але яны адрозніваюцца тым, што першы гаворыць пра тое, што сапраўды адбывалася, а другі – пра тое, што магло б адбыцца. Таму паэзія філасафічней і сур'ёзней гісторыі: паэзія больш гаворыць пра агульнае, гісторыя – пра адзінкавае" [1, с. 67–68]. Сапраўды, літаратурны твор утрымлівае мастацкія абагульненні, што дазваляе перадаць агульнае праз прыватнае.

"На імперыялістычнай вайне" (1926) беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага і "На Заходнім фронце без змен" ("Im Westen nichts Neues") (1929) нямецкага пісьменніка Эрыха Марыі Рэмарка – эстэтычнае ўвасабленне ваенных падзей, псіхалогіі, каштоўнасных уяўленняў чалавека на вайне. Гэтыя творы былі напісаны людзьмі, што непасрэдна ўдзельнічалі у так званай Вялікай вайне. Галоўны герой у "На імперыялістычнай вайне" Лявон Задума падобны да галоўнага героя "На Заходнім фронце без змен" Пауля Боймера. Абодва яны маладыя, гэта людзі з абвостраным успрыманнем свету, з творчымі схільнасцямі, з аналітычным складам мыслення. Лявон Задума – інтэлігент у першым пакаленні, які цікавіцца літаратурай, Пауль Боймер – таксама інтэлігент у першым пакаленні, што любіць літаратуру, спрабуе свае сілы ў паэзіі і драматургіі. Лявон яшчэ ў мірны час апынуўся ў арміі, ён хацеў скараціць час знаходжання на тэрміновай службе, таму пайшоў служыць дабраахвотна. Пауль Боймер разам са сваімі школьнымі сябрамі дабраахвотна пайшоў на фронт, калі пачалася вайна, каб служыць радзіме, абараняць, як яго ўпэўнівалі і ў што на самым пачатку верыў сам, яе інтарэсы. Абодва героі ваююць на Заходніх франтах: Лявон Задума – супраць немцаў на тэрыторыі Літвы і Прусіі, Пауль Боймер – супраць найперш французаў. Супастаўленне аксіясфер салдат рускай і нямецкай армій падчас Першай сусветнай вайны, увасобленых у мастацкіх творах, дае магчымасць прасачыць асаблівасці ўспрымання свету людзьмі, што вымушаны былі прызвычайвацца да новых абставінаў свайго існавання.

Твор "На імперыялістычнай вайне" з падзагалоўкам "Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы" літаратуразнаўцы звычайна адносяць да жанру аповесці, вядомы даследчык творчасці М. Гарэцкага М. І. Мушынскі называў "На імперыялістычнай вайне" мастацка-дакументальнай кнігай, артыкулюючы менавіта дакументальны пачатак у творы. Лявон Задума – гэта чалавек мірны і міралюбівы. Галоўнай каштоўнасцю чалавека, што апынуўся на вайне, Лявон, як і яго баявыя таварышы, лічыць чалавечае жыццё. Значнасць жыцця



Репозиторий ВГУ

акцэнтуецца пісьменнікам праз адлюстраванне шматлікіх ахвяр вайны. Маладому салдату маральна цяжка бачыць забітых: “Самыя розныя, страшней адна за адну позы мёртвых: скручаныя, ніц, наўзнак з выстаўленымі ўгару, сціснутымі кулакамі” [2, с. 30]. Першыя забітыя, хоць гэта былі і ворагі, выклікалі адчуванне трывогі, жаху, непапраўнасці той сітуацыі, у якую трапіў свет. Параненыя салдаты нагадвалі таварышам пра цану баявых аперацый. Вайна прывучала людзей да разумення, што рызыка павінна быць разумнай, што чалавек павінен паводзіць сябе абачліва, каб не стаць чарговай ахвярай вайны.

Мірнае існаванне ўспрымаецца салдатамі як найвялікшая каштоўнасць чалавечага жыцця. Лявон Задума не ідэалізаваў бытавы ўклад аднавяскоўцаў, іх стаўленне да жыцця, да будучыні, хлопца не задавальняў быт бацькоўскай сям'і, але ўдалечыні ад дому, на фронце, бацькоўскі дом здаваўся райскім кутком. Гукі “венскага” гармоніка аднойчы нагадалі Лявону пра родны кут: “Думкі мае ляцелі ў ціхамірнае даўнейшае жыццё ў мілай, роднай Магілёўшчыне. Святочны дзень, скачуць, гуляюць… А я тут бачу жудаснае поле смерці пад сінім, цёплым, безмяцежным небам” [2, с. 41]. Вайна ўспрымаецца салдатам як з'ява, што ператварае чалавека ў звера. З горыччу Лявон адзначае, што вайсковыя будні, магчыма, дзеля самазахавання асобы, прытупляюць розум, этычныя імператывы чалавека, і з горыччу канстатуе: “А ўсе – скаты двухногія. Хай жыве вайна – знішчэнне скатоў скатамі. Мы не людзі, мы – быдла…” [2, с. 57]. Геройства на вайне ўваходзіць у афіцыйную шкалу каштоўнасцей, але не ўваходзіць у асабісты складнік аксіясферы Лявона Задумы, у адрозненне, напрыклад, ад маладога прапаршчыка Сізова, у якога з-за адсутнасці вайсковага вопыту не знікла яшчэ кніжнае разуменне вайны і подзвігу. У Лявона жорсткі погляд на геройства і герояў: “На сучаснай вайне – усе героі ці, лепей кажучы, няма герояў, а ёсць толькі болей ці меней дысцыплінаванае быдла” [2, с. 72]. Калі Задума пачуў, што яго з таварышамі ўзнагародзяць Георгіеўскім крыжам за наладжванне сувязі ў час бою, то стаў сумнявацца ў сваім геройстве і геройстве таварышаў: “Якія ж мы героі… Георгіеўскія кавалеры? Каб не баяліся кары, каб не вайсковая дысцыпліна, ніводзін бы з нас, ні я, ні Пашын, ні Беленькі, пэўна, з месца не зрушыліся б” [2, с. 55]. Вайна для салдата – нудная і небяспечная праца. Вайна прымушае чалавека перагледзець агульнапрынятыя маральныя нормы, запаведзь “не скрадзі” там часта парушаецца, бо салдаты вымушаны займацца марадзёрствам, каб выжыць падчас адступлення.

Каштоўнасць для салдата ўяўляюць элементарныя бытавыя зручнасці: магчымасць па-чалавечы паспаць, памыцца, у час паесці. Сувязіста Задуму на фронце лёс не песціў: “Сон на мокрай зямлі пад дзіравым брызентам, па якім б'юць дажджавыя каплі, як у бубен” [2, с. 60]. Сон – падарунак для чалавека на вайне. Выпрабаванне сном было пакутлівым. Лявон заўважаў: “Да абеда ехалі. Страшэнная санлівасць апанавала мяне, бо за гэтыя тры дні паходу дужа змарыўся фізічна” [2, с. 42]. Сон, адпачынак на фронце становяцца нязбыўнай марай. Лявона абурае немагчымасць прывесці сябе ў парадак: “Жывеш тут нямыцькай, ваюючы з вашмі і хцівым сабакам кідаючыся на вядро з казённаю бурдою” [2, с. 73].

Герою М. Гарэцкага ўласціва пачуццё чалавечага гонару; зняважлівае стаўленне многіх афіцэраў і некаторых салдат да людзей выклікае ў яго абурэнне і ўнутраны пратэст. Лявон, у адрозненне ад юнкера Шалапутава, перакананы, што салдат і інтэлігент – гэта не антытэзы, што салдацкае не павінна пярэчыць інтэлігецкаму і інтэлігентнаму. Аксіясфера Лявона Задумы ўключае павагу да людзей справы, а не слова. У прыватнасці, казакі, што спадзяваліся вокаімгненна “перавярнуць дагары нагамі ўсю Германію” [2, с. 10], і камандзір батарэі, што абяцаў, Нямеччыне “разбіць морду ў квас” [2, с. 13], выклікаюць насмешку ў Лявона.

Раман “На Заходнім фронце без змен” (“Im Westen nichts Neues”) стаў своеасаблівым мастацкім дзённікам прадстаўніка “страчанага пакалення”. Гэты твор, як і “На імперыялістычнай вайне”, заснаваны на асабіста перажытым. Пауль Боймер пачынае самастойнае жыццё ў ваенных умовах, у 19 год ён трапляе на фронт. Рамантычныя ўяўленні Пауля пра вайну, пра абаронцаў радзімы, пра абавязак нямецкага юнака разбураюцца суровымі вайсковымі абставінамі. Пауль востра адчувае сваю неўкаранёнасць у жыцці, разумее адсутнасць перспектыў для сябе і для пакалення тых, чыё юнацтва супала з вайной. Найвышэйшая каштоўнасць і для Пауля Боймера ёсць жыццё. Адразу пасля прыбыцця на фронт хлопец адкрыў для сябе, што вайна ўладарна забірае чалавечыя жыцці. Паказальны ў рамане эпізод, калі Боймер успамінае пра тое, як іх адправілі на перадавую, каб змяніць часць, што там знаходзілася. Пра цяжкасці баёў на Заходнім фронце сведчыць той факт, што са 150 чалавек з роты, дзе служыў Пауль, вярнуліся жывымі толькі 80 чалавек.

Сон і ежа займаюць істотнае месца ў аксіясферы маладога нямецкага салдата Пауля Боймера. Ён заўважае: “Для солдата желудок и пищеварение составляют особую сферу, которая ему ближе, чем всем остальным людям” [3, с. 10]. Вайна развівае горшыя рысы чалавечая характару. У аднаго з сяброў Боймера, Кемерыха, у лазарэце ўкралі гадзіннік, учынак невядомага спісваецца на ваенныя абставіны, на дэфармацыю імі чалавечых характараў. Пауль і яго сябры-равеснікі на вайне адкрывалі сапраўдную



Рэпазіторый ВДУ

сутнасць чалавечых узаемаадносін, пазбаўляліся рамантычнага флёру, адмяжоўваліся ад высноў, якія ім сцвярджалі настаўнікі-выхавацелі і камандзіры. Каштоўнасцю для Пауля і сяброў была франтавая дружба. Боймера і яго сяброў аб'ядноўвала нянавісць да педантызму, да прыніжэння чалавечай асобы, з якой яны сустракаліся ў арміі і ў час адпачынку.

Для Пауля Боймера каштоўнасць мае кожнае імгненне жыцця: "Фронт – это клетка, и тому, кто в нее попал, приходится напрягать нервы, ждать, что с ним будет дальше. Мы сидим за решеткй, прутья которой – траектории снарядов; мы живем в напряженном ожиданиии неведомого. Мы отданы во власть случая. Когда на меня летит снаряд, я могу пригнуться, – и все; я не могу знать, куда он ударит, и никак не могу воздействовать на него" [3, с. 61]. Прыстасавальніцтва да абставін – важная ўмова выжывання чалавека на вайне ў паказе Рэмарка. Пауль заўважаў: "Мы словно альпинисты на снежных вершинах, – все функции организма должны служить только сохранению жизни" [3, с. 155]. Прага жыцця можа істотна мяняць чалавека: "Мы хотим жить, жить во что бы то ни стало; не можем же мы обременять себя чувствами, которые, возможно, украшали человека в мирное время, но совершенно неуместны и фальшивы здесь" [3, с. 83]. Адносіны да палонных рускіх салдат з боку нямецкіх салдат пазбаўлены нянавісці, прысутнічае разуменне, што гэта збег неспрыяльных абставінаў: "Чей-то приказ превратил эти безмолвные фигуры в наших врагов; другой приказ мог бы превратить их в наших друзей. Какие-то люди, которых никто из нас не знает, сели где-то за стол и подписали документ, и вот в течение нескольких лет мы видим нашу высшую цель в том, что род человеческий обычно клеймит презрением и за что он карает самой высшей карой. Кто же из нас сумел бы теперь увидеть врагов в этих смирных людях с их детскими лицами и с бородами апостолов? Каждый унтер по отношению к своим подчиненным, каждый классный наставник по отношению к своим ученикам является гораздо более худщим врагом, чем они по отношению к нам. И все же, если бы они были сейчас на свободе, мы снова бы стали стрелять в них, а они – в нас" [3, с. 113]. Салдат Кроп задае пытанне, для чаго нямецкія салдаты знаходзяцца на фронце: "Чтобы защищать свое отечество? Но ведь французы находятся здесь, чтобы защищать свое отечество. Кто же прав?" [3, с. 118].

Марай салдат становіцца цішыня. Пасля шматлікіх баёў вайскоўцам здаецца, што яны ўжо даўно памерлі: "Мы беспомощны, как покинутые дети, и многоопытны, как старики, мы стали чёрствыми, и жалкими, и поверхностными, – мне кажется, что нам уже не возродиться" [3, с. 74]. Сапраўдныя каштоўнасці для нямецкіх салдат ва ўмовах фронту – ежа і адпачынак ды захаванне жыцця. Салдаты не саромеюцца марадзёрства, іх забеспячэнне слабае ў параўнанні з французскімі салдатамі: "Поесть досыта – это так же ценно, как иметь надежный блиндаж; вот почему мы с такой жадностью охотимся за едой, – ведь она может спасти нам жизнь" [3, с. 72]. Існаванне чалавека на вайне ў адлюстраванні Рэмарка – спалучэнне надзвычайнага з будзённым, банальным. Так, перад чарговай атакай салдат Цьядзен вырашыў добра паесці, каб не памерці галодным, а Кат вырашыў пайсці ў бой галодным, каб не пакутаваць пасля магчымага ранення ў жывот.

Аксіясфера салдата Першай сусветнай вайны ў творах М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка ўключала пэўныя агульныя моманты: цэнтральны элемент аксіясферы ў абодвух аўтараў – жыццё, а таксама павага да асобы, сон, адпачынак. Паказальным элементам аксіясферы салдата ў Рэмарка было франтавое сяброўства. Перыферыйным элементам аксіясферы салдата ў Гарэцкага стаў гераізм, у Рэмарка ж ён адсутнічаў, бо гераізм і забойства былі несумяшчальнымі для яго герояў.

1. Аристотель. Об искусстве поэзии / Аристотель. – М. : Гослитиздат, 1957. – 158 с.
2. Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984–1986. – Т. 3 : На імперыялістычнай вайне; Віленскія камунары. – 1985. – 399 с.
3. Ремарк, Э. М. На Западном фронте без перемен. Возвращение : романы / Э. М. Ремарк. – Минск : Выш. школа, 1982. – 380 с.

**Марданов А. В.**

## ИДЕИ О СОЗДАНИИ РАКЕТНОЙ ТЕХНИКИ: ОТ НАУЧНОЙ ФАНТАСТИКИ ДО К. ЦИОЛКОВСКОГО И Г. ОБЕРТА

Вызывают интерес не только документальные и исторические источники по нашей теме, но и научно-фантастические произведения известных писателей. Ведь многие прогнозы относительно развития науки и техники в той или иной мере оправдались.

Так 1865 году французский писатель Жюль Верн (1828–1905) опубликовал научно-фантастический роман «Из пушки на Луну». Книга получила огромную популярность. В произведении Жюля Верна стволом пушки служила шахта глубиной 274 м с чугунными стенками, калибром 18,3 м. Вторую космическую скорость (11,5 км /с) снаряду должен был придать заряд пироксилина весом 180 т [1].

Репозиторий ВГУ